Учреждение «Государственный архив Могилевской области»

Віртуальны праэкт «Выдатныя людзі Беларусі»

# Шляхамі жыцця Максіма Гарэцкага



- Максім Іванавіч Гарэцкі нарадзіўся 18 лютага 1893 года ў вёсцы Малая Багацькаўка Магілёўскай губерні (цяпер – Мсціслаўскі раён Магілёўскай вобласці) у сялянскай сям'і Івана Кузьміча і Ахрасінні Міхайлаўны Гарэцкіх.
- Паводле ўспамінаў малодшага брата пісьменніка, Гаўрылы *«...сялянская сям'я бацькі і дзядзькі Якава складалася з 12 душ, жыла ў адной цеснай хаце з замшэлай саламянай страхою, з земляною падлогай і маленькімі акенцамі на адну шыбу. Асвятлялася хата лучынаю. Жылі бедна, кожная луста хлеба, кожная лыжка была на ўліку. Працавалі многа і цяжка. Часта хварэлі*...».



Бацькі Максіма Гарэцкага.
**Крыніца:** установа «Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва» (БДАМЛМ)

Першую навуку атрымаў у школе граматы ў в. Вялікая Багацькаўка. Потым некалькі гадоў вучыўся ў царкоўна-прыходскай школе ў сяле Вольша Аршанскага павета. Ужо ў той час Максім пачаў цікавіцца беларускай літаратурай і карыстаўся беларускай мовай.

У кастрычніку 1908 года прыехаў г. Горкі для падрыхтоўкі і паступлення каморніцка-агранамічную вучэльню.

Жыў у доме Якаўлева, займаўся ў рэпетытара Кроера.

Падчас вучобы пад кіраўніцтвам Максіма было створана невялікае таварыства аматараў беларускай літаратуры. Сябры гуртка пісалі невялікія допісы ў віленскую газету «Наша ніва». Гарэцкі адзін з першых пачаў пісаць па-беларуску карэспандэнцыі і малыя апавяданні з жыцця магілёўскіх сялян.

У Горках было напісана першае апавяданне «У лазні», якое надрукавала газета «Наша ніва» ў № 4 за 1913 год.



Хведар Чарнышэвіч, Максім Гарэцкі (стаіць), Лявон Гмырак пад час навучання ў Горках
**Крыніца: Wikimedia Commons**




Пасля сканчэння Горацкай каморніцка-агранамічнай вучэльні М.І. Гарэцкі быў накіраваны на працу ў Вільню. Дзе актыўна ўключыўся ў беларускі нацыянальны рух і працягнуў актыўную творчую дзейнасць. У 1914 годзе выдаў першы сборнік апавяданняў «Рунь».

Але пачатак Першай Сусветнай вайны прымусіў скарэктаваць планы творцы.

Каб не ісці на службу звычайным салдатам на 3 гады, Гарэцкі пачынае адбыванне вайсковай павіннасці як «вольназапісаны».

**Крыніца: Wikimedia Commons**

Ён трапіў на фронт ужо 24 ліпеня і ўдзельнічаў у жорсткіх баях. Найбольш страшны бой быў 27 жніўня пад Аленбургам ва Ўсходняй Прусіі, за гэты бой Гарэцкі быў узнагароджаны Георгіеўскім крыжам 4-й ступені. 25 кастрычніка пад Герытэнам быў паранены, ляжаў у шпіталі ў Вільні, Маскве, Магілёве і Смаленску.

У 1916 годзе быў накіраваны ў Паўлаўскае ваеннае вучылішча. Пасля сканчэння вучэльні атрымаў чын прапаршчыка. Лютаўскую рэвалюцыю сустрэў у Пінску.

Прызначаны ў камісію па рэквізіцыі сена ў сялян, але не любіў гэтай працы і адпрасіўся ў акопы. Вясной 1917 года захварэў на востры гастрыт, месяц быў у палявым шпіталі, потым эвакуяваны ў тыл.



У шпіталі, 1914 год
**Крыніца: Wikimedia Commons**

Кастрычніцкую  рэвалюцыю сустрэў у Смаленску, а ў лістападзе быў прызнаны непрыгодным  для страявой ваеннай службы праз хваробу.

Спачатку працаваў у газеце «Известия Смоленского Совета депутатов», а пасля супрацоўнічаў у мясцовых газетах «Западная коммуна», «Звязда» (са жніўня 1918 года).

Пасябраваў з Янкай Купалай і Вільгельмам Кнорыным.

У пачатку студзеня 1919 года пасля абвяшчэння СССБ разам з рэдакцыяй «Звязда» пераехаў у Мінск, а крыху пазней потым у Вільню.

Пры раптоўным захопе Вільні польскім войскам (21 красавіка 1919 года) апынуўся на акупаванай тэрыторыі.

Працуе настаўнік беларускай мовы і літаратуры Віленскай беларускай гімназіі, а таксама выкладчыкам Беларускіх настаўніцкіх курсаў і Вышэйшых літоўскіх педагагічных курсаў.

Менавіта падчас працы ў Віленскай беларускай гімназіі ён знаёміцца са сваёй будучай жонкай настаўніцай пачатковых класаў Лаенілай Юстынаўнай Чарняўскай (1893-1976). Менавіта жонка і дачка Галіна сталі захавальнікамі асабістагага архіву пісьменніка і першымі яго біяграфамі.



З выпускнікамі гімназіі. Максім Гарэцкі — настаўнік гімназіі, сядзіць у першым шэрагу справа
**Крыніца: БДАМЛМ**



Фота з жонкай, сынам Леанідам і дачкой Галінай
**Крыніца: БДАМЛМ**






Бюст М.Гарэцкага на будынку ў якім месціўся Інстытут беларускай культуры
**Крыніца: БДАМЛМ**

Вокладка кнігі
**Крыніца: Нацыянальная бібліятэка Беларусі**

Пасля палітычнага пераследу з боку польскіх латышскіх улад Максім Іванавіч ў кастрычніку 1923 года прыняў рашэнне вярнуцца ў БССР, спачатку жыў з сям’ёй ў Мінску. Працаваў на рабфаку БДУ, настаўніцкіх курсах і ў Інстытуце Беларускай культуры (Інбелкульце). Публікуе кнігу вайсковых запіскі «На імперыялістычнай вайне», актыўна друкуецца ў перыядычным друку.

Згодна з пастановай народнага камісарыята асветы ад 26 студзеня 1926 года пераязджае на сталую працу ў Беларускую дзяржаўнаю сельскагаспадачую акадэмію, дзе ўзначальвае кафедру беларусазнаўства.

Па яго запрашэнні на кафедры працуюць вядомыя педагогі і літаратары Паўліна Мядзёлка і Юрка Гаўрук.



ПОЛУЧЕНО 1? ФЕВР 1926 Вх. № 292

ПАСТАНОВА № 15

Народнага Камісарыятк Асьветы БССР

Менск, "25" студзеня 1926 г.

Аб прызначэньні Максіма ГАРЭЦКАГА навуковым супрацоўнікам Беларускае Дзяржаўнае Сельска-Гаспадарчае Акадэміі, імя Кастрычнікавае Рэвалюцыі.

Народны Камісарыят Асьветы пастанаўляе:

Прызначыць Максіма ГАРЭЦКАГА на пасаду доцэнта па катадры Беларусазнаўства ў Беларускай Сельска-Гаспадарчай Акадэміі, імя Кастрычнікавае Рэвалюцыі з 1 лютага 1926 году.

Нам. Наркамасьветы /Баліцкі/

Сп. аб. Кіраўніка Спраў /Салік/

Першатвору адпавядае!
Загадчык Канцылярыі

А.П.

**Крыніца:** ДАМаг, ф. 536, воп. 2, спр. 97, арк. 2



25 Навуковыя працы (падрабязна).

| №№ чарг. | НАЗВА ПРАЦ | Дзе надрукованы, калі у рукапісі, абмовіць асабліва | Год друку |
|---|---|---|---|
| 1 | Гісторыя беларускае літар. | III выд., Менск, ~~1924~~ | 1920, 1922, 1924. |
| 2 | Хрысцам. белар. літар. XI в. – XIX в. | Вільня | 1922 |
| 3 | Выпісы з белар. літар. п. I (супольна з другімі аўтар.) | Менск, ~~1925~~ | 1925 |
| 4 | Белар.-расійскі слоўнічак | III выд. Менск | 1919, 1920, 1925 |
| 5. | Расійска-белар. слоўнік (супольн. з Байкоў) | Менск | 1924 |
| 6 | Невялічкі белар.-рас. слоўн. (супольна з Г. Гарэцкім) | Смаленск | 1918. |
| 7. | Krótki zarys liter. białor. (пераклад з белар.) | Wilno | 1922 |
| 8 | Доктар Франц. Скарына (артыкул у „Волн. Белар.") | Менск | 1917. |
| 9 | Гістар. беларуск. тэатру ў перш. палове XIX в. | Зьдзена ў альманах Белар. Дзярж. Тэатру | 1924. |
| 10 | Праграма для зьбірання вусных народных твораў (супольна з праф. І. І. Замоціным) | Журнал „Наш Край" № 2 Менск. | 1926. |
| | Рукапіс: Беларускі этнаграфічны зборнік, песні і прыпеўкі (з нотамі), сабраныя па ўсёй Беларусі ў 1922-26 гг. | | |

**Крыніца:** ДАМаг, ф. 536, воп. 2, спр. 97, арк. 9


# АСАБОВЫ АРКУШ

8

**Навуковага працауніка Беларускае Дзяржаунае Акадэміі Сельскае Гаспадаркі. імя Кастрычнікавае Рэвалюцыі.**

1. Прозьвішча Гарэцкі імя Максім па бацьку Іванавіч
2. Год нараджэньня 1893 месца Багацькаўка, 25 в. на паўн.-зах. ад Мсціслаўля
3. Нацыянальнасьць беларус
4. Родная мова беларуская
5. Якімі мовамі, апрача роднай, свабодна уладаеце расійскай, польскай
6. Якія мясцовасьці СССР добра ведаеце па працы Смаленшчыну, БССР.
7. Дзе былі за межамі, калі, як доуга, мэта прабываньня, чым займаліся
   У Вільні, у Дзьвінску, з 1919 да 1923 г., зарабляў там і да таго, займаўся культурнай беларуск. работай
8. Социяльнае паходжаньне (ранейшае саслоуе, стан) бацькі — працоўныя сяляне, і цяпер займаюцца земляробствам у Багацькаўцы
9. Асноуная прафэсія Настаўніцтва
10. Сямейнае становішча і склад сям'і (пералічыць паіменова усіх сяброу сям'і і годы іх нараджэньня) Бацька — Іван Гарэцкі, гадоў 70; Маці — Агапісія Гарэцкая, гадоў 65; Жонка — Леаніла Гарэцкая, гадоў 32; Дачка — Галіна Гарэцкая, 5 год; Сын — Леанід Гарэцкі 4 гады
11. Адукацыя (дзе вучыліся і калі скончылі) Каморна-агран. школа у Горках 1913 г. Віленскі ўнівэрс. (толькі слухаў лекцыі)
    а) спэцыяльнасьць Белар. літаратура
12. Ці служылі у арміі (якой, калі, род аружжа, рангі, званьне, пасада і г. д; удзел у вайсковых дзеяньнях, калі, дзе мабілізаваны
    Мусіў пайсьці вальнанаёмным 1/VII 1914 г., быў у баях у Усходняй Прусіі, цяжка ранены, звольнены на белым білеце у царск. арміі і у Чырвонай арміі у Смаленску, у восені 1918 г.
13. Ці мелі грамадзянскі чын да 1917 г. і які (апошні) Ня меў
14. Да якой партыі належыце (з якога часу, якой арганізацыі, калі прыняты)
    Не належу


15. Да якіх партыяу належылі раней (з якога часу, якой арганізацыі, калі прыняты) Не належыў
16. Ці прыцягвались да суду (калі, за вошта які судом, прыгавор)
    У 1922 г., у Вільні, польскім, за рэдагав. „Белар. Ведам." і камунізм, быў высланы.
17. З якога часу лічыцеся сябрам прафсаюзу, якога, № сяброускага білету
    Быў у Вільні сябрам Белар. Вуч. Саюзу з 1919 г., цяпер у саюзе Прац. Асв. з восені 1923 г., № 338
18. Падданства да 1917 г. Расійскае
    „ цяпер С.С.С.Р.
19. а) Ці уладалі раней уласнасьцю і якой Не уладаў
    б) Ці уладаеце цяпер уласнасьцю і якой Не уладаю
20. Ці прымалі удзел у зьездах, конфэрэнцыях (якіх, калі, дзе, кім былі упоунаважаны)
    1. Зьезд настаўн. белар. сярэдн. школ у Вільні, 1922 г., ад Віленск. Бел. Гімн.
    2. Краязнаўч. канфер. у Менску у 1926 г., ад Інбелкульту
21. Па якіх дысцыплінах вялі самастойныя заняткі і колькі гадоу
    Па белар. мове і літаратуры з 1919 г.
22. Ці здана дыпломная праца, калі, дзе Не здана
23. Ваша службовая, грамадзянская і партыйная праца (апрача акадэмічнай):

| ДАТЫ: | Дзе працавалі: у дзяржаун., прафес., парт., коопарат., вайсков., прыват. установах і прадпрыемствах | ПАСАДА | Па абраньню, найманьню, прызначаньню |
|---|---|---|---|
| Ад 1913 да 1914 | Віл. Зем. Камісія | Каморнік | Найманы |
| 1914 — 1917 | Вайсковая служба | Вольнанаёмны | „Прызначаны" |
| 1917 — 1919 | „Звезда", „Известия" См. Сов. і інш. | Стала супрацоўнік | „Найманы" |
| 1919 — 1923 | Віленск. Белар. Гімн. | Настаўнік | „Найманы" |
| 1923 — 1926 | Рабфак і Ўнівэрс. у Менску | Настаўнік | Найманы і выбраны |
| 1926 — | Акадэмія у Горках | | Назначаны |
| „ „ | | | |
| „ „ | | | |
| „ „ | | | |

**Крыніца:** ДАМаг, ф. 536, воп. 2, спр. 97, арк. 8

**Крыніца:** ДАМаг, ф. 536, воп. 2, спр. 97, арк. 8 адв.

Акрамя выкладчыцкай і творчай дзейнасці займаецца збіраннем фальклора нават на Дальнім Усходзе, працягвае даследваць беларускую літаратуру, піша гісторыю літаратурнага аб'яднання «Маладняк» складаць руска-беларускія слоўнікі.



ПАСЬВЕДЧАНЬНЕ № 7/ас.

Прад'яўнік гэтага Гарэцкі Максім Янкаў

зьяўляецца дацэнтам пры катэдры беларусазнаўства Беларускай Дзяржаўнай Акадэміі С. Г. імя Кастрычнікавай Рэвалюцыі, што і сьведчыцца.

Пасьведчаньне гэта годна па 3-е верасьня 1927 г.

„3" чэрвеня 1927 г.

Рэктар Акадэміі, Прафэсар

Загадчык агульнага аддзелу

Крыніца: ДАМаг, ф. 536, воп. 2, спр. 97, арк. 24



Кіраўніцтву Беларускай дзяржаўнай акадэміі сельскае гаспадаркі

дацэнта катэдры беларусазнаўства Максіма Гарэцкага

Заява.

Прашу звольніць мяне ад працы ў акадэміі з 1-га верасьня гэтага году. У свой час я даваў згоду ў Наркамасьвеце на працу ў акадэміі ў працягу 2½ гадоў, і тэрмін гэты цяпер скончыўся. Лічу, што выкладаньне беларусазнаўства ў акадэміі знаходзіцца ў такім [illegible] стане, што ў 1928-29 навучальным годзе могуць выканаць усю працу т. Гаўрук і т. Мядзёлка. Калі-ж бы кіраўніцтва акадэміі знайшло патрэбным запрасіць новага працаўніка, дык яго лёгка знайсьці яшчэ да пачатку заняткаў. Падаць заяву раней я ня мог дзеля незалежных ад мяне прычын.

Вельмі прашу звольніць мяне таксама ад працы ў экзамінацыйнай камісіі, якую я павінен рабіць, займаючы пасаду да 1-га верасьня, бо на гэты час якраз прападае мой пераезд з сям'ёй.

М. Гарэцкі.

6 жніўня 1928 г.

Заява аб звальненні ад 6 жніўня 1928 года
**Крыніца:** ДАМаг, ф. 536, воп. 2, спр. 97, арк. 28

Летам 1928 года вяртаецца на сталае жыхарства ў Мінск, працягвае працу навуковым супрацоўнікам ў Інбелькульта.

19 ліпеня 1930 года арыштаваны па сфабрыкаванай крымінальнай справе «Саюза вызвалення Беларусі», 10 траўня 1931 года асуджаны да 5 годы высылкі ў г. Вятка (з 1934 г. назва змянілася на Кіраў).

У лістападзе 1937 года паўторна арыштаваны і па рашэнні «тройкі» 10 лютага 1938 года быў растраляны.

Рэабілітаваны 15.11.1957 па скарзе дачкі Галіны.




Фота з архіўна-следчай справы
**Крыніца: Wikimedia Commons ды сайта «Открытый список»**



Архіў пісьменніка захоўваецца ў фондах Цэнтральнай навуковай бібліятэкі НАН Беларусі імя Я.Коласа і ўстанове «Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва», у архіўным фондзе Беларускай дзяржаўнай сельскагаспадачй акадэміі ўстановы «Дзяржаўны архіў Магілёўскай вобласці» захоўваецца асабовая справа М.І.Гарэцкага.





**Крыніца: Wikimedia Commons**

**Крыніца: https://museums.by**


6-20/19 320

ПОСТАНОВЛЕНИЕ № 6-47-20/19

бюро Могилевского обкома КПБ, исполнительного комитета областного Совета народных депутатов

от 28 апреля 1987 года

Об установлении мемориальной доски в честь белорусского писателя М.И.Горецкого.

1. Учитывая большой вклад Максима Ивановича Горецкого в белорусскую литературу, его плодотворную работу в Белорусской сельскохозяйственной академии установить мемориальную доску с барельефом писателя в г.Горки на здании, где он жил в 1926-1928 годах.

2. Утвердить следующий текст на мемориальной доске: "В этом доме в 1926-1928 годах жил известный белорусский писатель, выпускник Горецкого землемерно-агрономического училища, заведующий кафедрой белорусского языка и литературы Белорусской сельскохозяйственной академии Максим Иванович Горецкий".

3. Просить ЦК Компартии Белоруссии и Совет Министров БССР утвердить настоящее постановление.

Секретарь Могилевского обкома Компартии Белоруссии — В.ЛЕОНОВ

Председатель Могилевского облисполкома — А.ЯНОВИЧ

3-бт.

Пастанова бюро абкама КПБ і Магілёўскага абласнога выканаўчага камітэта ад 28 красавіка 1987 № 6-47-20/19
**Крыніца:** ДАМаг, ф. 7, воп. 5, спр. 3655, арк. 1320




Шыльда на вучэбным корпусе № 4 Беларускай дзяржаўнай сельскагаспадачнай акадэміі
**Крыніца: Radzima.org**



Рашэнне Горацкага раённага выканаўчага камітэта ад 15 кастрычніка 1992 № 12-3
**Крыніца:** ДАМаг, ф. 540, воп. 2, спр. 1002, арк. 13



11
13

ГОРАЦКІ
РАЁННЫ САВЕТ
НАРОДНЫХ ДЭПУТАТАЎ
МАГІЛЕЎСКАЙ ВОБЛАСЦІ
ВЫКАНАЎЧЫ КАМІТЭТ

ГОРЕЦКИЙ
РАЙОННЫЙ СОВЕТ НАРОДНЫХ
ДЕПУТАТОВ
МОГИЛЕВСКОЙ ОБЛАСТИ
ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

РЕШЕНИЕ

от 21.10.92. № 12-3
г. Горки

О присвоении Горецкой центральной районной библиотеке имени Максима Горецкого.

С целью увековечивания памяти классика белорусской литературы Максима Ивановича Горецкого и во исполнение районной программы "Спадчына", исполнительный комитет районного Совета народных депутатов
РЕШИЛ:
Просить исполнительный комитет Могилевского областного Совета народных депутатов ходатайствовать перед Советом Министров Республики Беларусь о присвоении Горецкой центральной районной библиотеке имени Максима Горецкого.

Председатель районного Совета народных депутатов — И.А.Холява
Управляющий делами — В.А.Чеботаревский

Цэнтральная бібліятэка
ім. М. Гарэцкага
**Крыніца: yandex.by**

З 2013 года цэнтральная бібліятэка ім. М. Гарэцкага ўваходзіць ў склад дзяржаўнай установы культуры «Горацкая раённая бібліятэчная сетка»

# У гонар Максіма Гарэцкага названы вуліцы ў Мінску, Горках і Мсціславе.



91

ГОРАЦКІ ГАРАДСКІ САВЕТ НАРОДНЫХ ДЭПУТАТАЎ МАГІЛЁЎСКАЙ ВОБЛАСЦІ ВЫКАНАЎЧЫ КАМІТЭТ

ГОРЕЦКИЙ ГОРОДСКОЙ СОВЕТ НАРОДНЫХ ДЕПУТАТОВ МОГИЛЕВСКОЙ ОБЛАСТИ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

РЕШЕНИЕ

от 15.10.92 г № 10-12
г. Горки

О переименовании улицы "40 лет Октября" в улицу имени М.И.Горецкого.

Заслушав и обсудив информацию отдела культуры горрайисполкомов о жизни и деятельности белорусского писателя и ученого М.И.Горецкого в Горках, в целях более широкой пропаганды Белорусского языка и литературы, а также творчества М.И.Горецкого, выпускника и преподавателя Белорусской сельскохозяйственной академии и в связи со 100 летием со дня его рождения,

Исполком городского Совета народных депутатов

РЕШИЛ:

1. Переименовать улицу "40 лет Октября" в улицу имени М.И. Горецкого.

2. ПО ЖКХ (директор т.ЧИКИЗОВ С.А.) выполнить необходимые работы по замене аншлагов названия улицы.

3. Бюро технической инвентаризации (начальник ТОИЧКИН А.Н.) внести изменения в техническую документацию в соответствии с данным решением.

Председатель городского Совета — В.Е.РЕНДОВ

Управляющий делами исполкома — В.А.КОНДРАТОВ

Рашэнне Горацкага гарадскога выканаўчага камітэта ад 15 кастрычніка 1992 № 10-12
**Крыніца:** ДАМаг, ф. 1266, воп. 2, спр. 718, арк. 91




Забудова вуліцы М.Гарэцкага ў г. Мінску
**Крыніца: Wikimedia Commons**

Згодна з пастановай Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь да стагоддзя з дня нараджэння Максіма Гарэцкага ў в. Багацькаўка быў створаны філіял Дзяржаўнага музэя беларускай літаратуры, з 2011 года – філіял ДУК «Мсціслаўскі раённы гісторыка-археалагічны музэй».






Фота адноўленнай ў 1993 годзе хаты, у якой месціцца музэйная экспазіцыя ў в. Багацькаўка і мемарыяльнай дошкі на ёй. Бацькоўская хата (фота выбрана фонавай выявай гэтай віртуальнай выставы) не захавалася.
**Крыніца: «СБ-Беларусь сегодня»**

Памяці Максіма Гарэцкага прысвячалі свае творы Алесь Пісьмянкоў, Ніл Гілевіч, Віктар Шніп і іншыя беларускія паэты.

**Ніл Гілевіч**
**Памяці Максіма Гарэцкага**

Афіша спектакля «Дзве душы»

Дзе вы, дбайныя рупліўцы гоняў родных?
Мы сягоння ў працы побач быць маглі б.
Маладых яшчэ скасілі вас нягоды,
Адарваўшы ад бацькоўскіх гнёзд-сяліб.

Але вера, што калісьці вас натхняла
У вялікаснай сяўбе і на жніве, —
Тая вера не памерла, не сканала:
Тая вера, тая вера ў нас жыве!
1974 г.

Паштовая марка у гонар М.Гарэцкага
**Крыніца: Wikimedia Commons**






Творчасць М.Гарэцкага натхняе айчынных дзеячаў мастацтваў на пастаноўкі яго твораў. Сярод іх вялікай папулярнасцю карыстаюцца аповесць «Жартаўлівы Пісарэвіч» і п'еса «Дзве душы». Сярод іх пастаноўкі В.Ермаловіча і М.Пінігіна.

Афіша спектакля «Жартаўлівы Пісарэвіч»
**Крыніца:** ДАМаг, ф. 1244, воп. 32, спр. 23, арк. 22

Афіша спектакля «Дзве душы»
**Крыніца: Нацыянальныя акадэмічны тэатр імя Я.Купалы**



З 1993 года дзейнічае фонд братоў Гарэцкіх, якім працяглы час кіраваў пляменнік пісьменніка акадэмік НАН Беларусі Радзім Гаўрылавіч Гарэцкі (1931-2025). Сярод іншага ён арганізуе Гарэцкія чытанні.


4

Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь
Упраўленне культуры Брэсцкага аблвыканкама
Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры
Музей беларускага Палесся
Інстытут літаратуры імя Янкі Купалы НАНБ
Рэспубліканскі фонд імя братоў Гарэцкіх

ПРАГРАМА
VIII
ГАРЭЦКІХ ЧЫТАННЯЎ

г. Пінск
16 - 18 чэрвеня 1999 г.

Праграма VIII Гарэцкіх чытанняў з паметкамі В.Ермаловіча
**Крыніца:** ДАМаг, ф. 1244, воп. 32, спр. 23, арк. 4



# Дзякуй за ўвагу!

Віртуальная выстава падрыхтавана на аснове архіўных дакументаў установы «Дзяржаўны архіў Магілёўскай вобласці», а таксама матэрыялаў з адкрытых інтэрнэт-крыніц.